**Ратнікава, А.** Два гады і два месяцы па замене / А. Ратнікава // Герой працы (Шуміліна). — 2000. — 15 лют. — С. 2.

## ДВА ГАДЫ І ДВА МЕСЯЦЫ ПА ЗАМЕНЕ



Павел Станіслававіч Субач, што цяпер жыве ў Сіроціне, трапіў у гарачае афганскае пекла не як малады салдат тэрміновай службы. Да гэтага часу ў яго была даволі працяглая (з 1975 года) звыштэрміновая служба ў Прыбалтыцы спачатку ў якасці інструктара, потым – камандзіра ўзвода. Тут было спакойна, а галоўнае – мірна, тут была сям'я: жонка і сын. Да ваеннага Афганістана было яшчэ вельмі далёка. У 1984 годзе Паўла Станіслававіча вызвалі да галоўнага камандавання і паведамілі, што яму варта змяніць месца службы, бо неабходна замяніць загінуўшага ў Афгане інструктара. Заданне было ясным і безапеляцыйным. На замену дык на замену.

Не два дні і не два месяцы ваяваў Павел Станіслававіч Субач на афганскай зямлі, хаця часам і два дні могуць стацца вечнасцю і цяжкім, не чалавечым выпрабаваннем. У самы разгар вайны, з 1984 па 1986, дакладней, два гады і два месяцы давялося служыць у Афганістане інструктару. Неўзабаве яго прызначылі начальнікам склада, потым старшым прапаршчыкам.

Стараецца ўсё забыць, усё, што прыйшлося ўбачыць і пераежыць. Ды хіба магчыма ўсё сцерці з чалавечай памяці, калі амаль кожную хвіліну знаходзіўся ў напружанні, на нервах, на валаску ад смерці. Гэта з таго часу з'явілася на скронях сівізка. «Усё ж такі гады лечаць, – прызнаецце Павел Станіслававіч. – Бывае, праўда, і цяпер, калі ўспамінаеш, мандраж па целе, а тады кожная ноч, кожны сон быў вельмі трывожным і неспакойным». Першыя месяцы пасля вяртання ў Савецкі Саюз жонцы не раз прыходзілася начамі супакойваць трызненні мужа, залечваць душэўныя раны. А яму часта ўзгадвалася, як на вачах узарваўся камандзір палка, як часта трапляў з сябрамі пад душманскія абстрэлы, як даводзілася рызыкаваць самым дарагім – асабістым жыццём.

Мусіць, шчаслівы быў старшы прапаршчык – Бог мілаваў ад кулі і ад бомбы. Праз два з лішкам гады Паўлу Станіслававічу Субачу прыслалі замену, бо ім дазвалялася не больш двух з паловай гадоў ваяваць у Афганістане. Пасля вярнуўся зноў на ранейшае месца ў Прыбалтыку. Там і працягваў служыць. Дваццаць тры гады прысвяціў П. С. Субач Узброеным Сілам. З іх самымі незабыўнымі, самымі цяжкімі сталі гады службы ў Афганістане, калі давялося трапіць на сапраўдную вайну. А вайна – страшная справа без дазволу забірае жыцці непавінных людзей.

Пасля звальнення з арміі П. С. Субач з жонкай, сынам і дачкой пераехаў да сябе на радзіму. У Сіроціне яны аселі, тут мірна і сумленна жывуць і працуюць.

**А. Ратнікава**